контрольные работы или устные опросы. На основе результатов преподаватель должен быть готов корректировать учебный план, методы работы с группой [3, с. 19].

Адаптивное обучение представляет собой мощный инструмент для повышения эффективности занятий по иностранному языку в неязыковых вузах. Индивидуализация процесса обучения, регулярная обратная связь, гибкость в организации занятий и использование современных технологий – все это способствует созданию оптимальных условий для успешного освоения языка студентами с различными уровнями подготовки. Реализация принципов адаптивного обучения не только улучшает результаты студентов, но и делает процесс изучения языка более увлекательным и мотивирующим.

Литература:

1. Бычков, В. А. Адаптивное обучение в цифровую эпоху: интеграция искусственного интеллекта и педагогических методик / В. А. Бычков, С. С. Патока // Управление образованием. – 2023. – Т. 13, № 11–1 (70). – С. 92–100.

2. Скудняков, Ю. А. Один из подходов к организации адаптивного обучения с применением цифровых технологий / Ю. А. Скудняков // Информационные технологии в управлении и обучении : сб. ст. междунар. науч.-практ. конф., Минск, 2024. – Мн. : БГУИР, 2024. – С. 112–114.

3. Пласс, Я. Л. Динамические источники данных для оценки характеристик учащихся в адаптивных системах обучения = Using dynamic sources and assessments of learner characteristics in adaptive learning systems / Я. Л. Пласс, Ш. Павар // Educational Technology Research and Development. – 2020. – Т. 3, № 2. – С. 17–22.

## МЕТАД «КЕЙС-ТЭХНАЛОГІІ» ЯК АДЗІН З ЭФЕКТЫЎНЫХ СРОДКАЎ ЗАСВАЕННЯ МЕДЫЦЫНСКАЙ ТЭРМІНАЛОГІІ

**Качан А. С., Носік А. А.**

Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт
г. Мінск, Рэспубліка Беларусь

Сучасная арганізацыя адукацыйнага працэсу немагчыма без інтэрактыўных тэхналогій. Тэхналогія «кейс-метад» была распрацавана спецыялістамі Школы бізнеса і права Гарвардскага ўніверсітэта (ЗША) у 40–50 гг. XX ст. і зарэкамендавала сябе як эфектыўны і прагрэсіўны метад навучання.

Кейс-метад (ад англ. case – выпадак, сітуацыя) – тэхналогія навучання, у аснове якой ляжыць аналіз і рашэнне навучэнцамі рэальных, набліжаных да жыцця сітуацый (кейсаў) з розных абласцей дзейнасці: эканоміка, медыцына, педагогіка. Намі ен быў выкарыстаны ў працэсе выкладання дысцыпліны «Беларуская мова: прафесійная лексіка» ў медыцынскім вузе.



Репозиторий ГрГМУ

Кейс-метад дазваляе ўдасканальваць навыкі, неабходныя для актуалізацыі і прымянення тэарэтычных ведаў у прафесійнай дзейнасці. Па-першае, студэнты вучацца аналізаваць сітуацыі, вызначаць прычыны і наступствы, шукаць рацыянальныя рашэнні, што спрыяе развіццю крытычнага мыслення. Па-другое, метад дазваляе прымяняць тэарэтычныя веды на практыцы, што робіць навучанне больш матывуючым. Па-трэцяе, падчас абмеркавання і прэзентацыі сваіх рашэнняў студэнты практыкуюць маўленчыя і пісьмовыя навыкі, а таксама ўдасканальваюць веданне беларускай мовы, што прыводзіць да павышэння ўзроўню моўнай кампетэнцыі. Па-чацвертае, групавая работа і адкрытае абмеркаванне стымулююць цікавасць і актыўнасць, што важна для эфектыўнага навучання і сацыяльнай камунікацыі.

Работа па гэтай тэхналогіі прадугледжвае два этапы: падрыхтоўчы этап і этап правядзення. У час падрыхтоўчага этапа складаецца заданне: падбіраецца сітуацыя, а затым фармулююцца пытанні, на якія павінны адказаць навучэнцы пасля аналізу прапанаванай інфармацыі. На этапе правядзення адбываецца непасрэдная праца студэнтаў з кейсам. Навучэнцы пастаўлены ў сітуацыю, калі неабходна наладзіць камунікацыю на беларускай мове не толькі з выкладчыкам, але і з іншымі ўдзельнікамі групы. Гэты этап пачынаецца з фарміравання мікрагруп, кожная з якіх працуе з асобным матэрыялам, працягваецца абмеркаваннем і пошукам агульнага рашэння, завяршаецца прэзентацыяй атрыманых вынікаў.

Студэнты-медыкі павінны ўмець аналізаваць сітуацыі, разбірацца ў сутнасці праблем, прапаноўваць магчымыя рашэнні і выбіраць аптымальныя з іх. Паколькі ўрач вырашае кейсы кожны раз, калі ставіць пацыенту дыягназ і назначае лячэнне, то і эфектыўнае рашэнне залежыць у першую чаргу не толькі ад ведання медыка-біялагічных дысцыплін, але і ад валодання прафесійнай тэрміналогіяй, у тым ліку і беларускамоўнай.

Кейс-метад можа быць паспяхова выкарыстаны на занятках па беларускай мове, паколькі ўяўляе сабой комплексную тэхналогію, якая актуалізуе ўсе віды маўленчай дзейнасці. А. Ю. Аляксінская, А. А. Жалезнякова апісваюць шляхі прымянення дадзенага метаду пры навучанні маўленню, аўдзіраванню, чытанню і пісьму [1, с. 39]. Так, падчас рашэння кейса студэнты павінны ўмець вербалізаваць свае маўленчыя інтэнцыі ў адпаведнасці з правіламі маўленчага этыкету і ўлічваць сацыяльна-паводзінскія ролі камунікантаў. Гаварэнне трэніруецца на этапе абмеркавання кейса (палілог), прэзентацыі рашэння кейса (маналог), абмеркавання прапанаванага рашэння кейса (дыялог/палілог). Вусная гаворка ўтрымлівае як рэпрадуктыўную частку (пераказ сітуацыі, вербалізацыя праблемы кейса), так і прадуктыўную (уменне рэалізаваць такія маўленчыя інтэнцыі, як ацэнка сітуацыі, выказванне ўласнага меркавання, яго аргументацыя, выражэнне сумнення, згоды / нязгоды, прывядзенне контраргументаў і просьба паўтарыць або ўдакладніць інфармацыю) [1, с. 41].



Репозиторий ГрГМУ

Асноўная педагагічная мэта кейс-метаду – сумеснымі намаганнямі мікрагрупы навучэнцаў прааналізаваць канкрэтную сітуацыю і выпрацаваць практычнае рашэнне [2, с. 75].

Адной з галоўных умоў кіравання навучаннем і развіцця мыслення з'яўляецца папярэдняя пастаноўка заданняў, якія ствараюць праблемныя сітуацыі і актывізуюць разумовую дзейнасць навучэнцаў [2, с. 76].

Для правядзення паспяховага і прадуктыўнага занятку з ужываннем кейс-метаду неабходна наяўнасць трох асноўных складнікаў: якаснага кейса, падрыхтаванасці студэнтаў і гатоўнасці самога выкладчыка да арганізацыі працы з кейсам і вядзення дыскусіі.

Тэхналогію «case-study» на занятках па беларускай мове можна прымяняць на розных этапах вывучэння лексікі з улікам мэт і форм навучання.

1. Напрыклад, задаюцца тэмы: «Уласнабеларуская і запазычаная медыцынская лексіка», «Частотнасць ужывання грэка-лацінскіх тэрмінаэлементаў у складзе складаных і вытворных клінічных тэрмінаў».

Студэнцкая аўдыторыя дзеліцца на 3 групы – 2 праблемныя і 1 фокус-група. Першая група прытрымліваецца аднаго пункту гледжання на тэму і шукае плюсы, другая – мінусы. Кожная група абмяркоўвае сітуацыю, выказвае аргументы на карысць сваей пазіцыі, затым прадстаўляе свае меркаванне з доказамі. Фокус-група сочыць за выступленнем, выбірае найбольш аб'ектыўныя і граматна аргументаваныя довады.

Такім жа чынам можна абмеркаваць многія іншыя тэмы, напрыклад, «Агульначалавечыя і маральныя якасці ўрача», «Культура маўлення ў медыцынскай сферы» і г. д.

2. Даецца заданне скласці тэрміны з пачатковымі тэрмінаэлементамі *гастр-, псіх-* або канцавымі *-логія, -скапія, -эктамія, -некроз*. Студэнты дзеляцца на 3-4 мікрагрупы, кожная з якіх атрымлівае свой набор картак з тлумачэннем таго ці іншага тэрміна. Задача студэнтаў – адабраць карткі з неабходнымі тэрмінаэлементамі і ўтварыць тэрміны аднаго сэнсавага рада.

3. Выкладчык прапаноўвае абмеркаваць праблему «Здаровы лад жыцця – асабістая справа кожнага чалавека». Група дзеліцца на 2 падгрупы, адна з якіх рыхтуе кейс у падтрымку прапанаванага тэзіса, другая – аргументуе супрацьлеглую пазіцыю. Важна, каб студэнты падабралі факты з літаратуры, перыядычных выданняў, уласнага сацыяльнага вопыту, падрыхтавалі прэзентацыю сваей каманды і падвялі вынікі, акцэнтуючы ўвагу на пазіцыі сваей каманды.

4. Можна прапанаваць студэнтам сітуацыю па складанні дыялогаў «Урач – пацыент», «Фармацэўт – пакупнік». Групам раздаюцца карткі, на якіх змешчаны рэплікі. Студэнты павінны не толькі дапоўніць іх свамі выразамі, але і размеркаваць на тыя, якія можна выкарыстаць у працэсе камунікацыі і якія нельга, прывеўшы пры гэтым сістэму аргументаў на карысць свайго выбару.

Рэпазіторый ГрДМУ

5. Метад «case-study» можна прымяняць пры правядзенні заняткаў-дыскусій па актуальных тэмах, напрыклад: «Як быць здаровым», «Выбар прафесіі», «Чаму ўрачы любяць лячыць, але не любяць лячыцца» і г. д.

Такім чынам, сітуацыйныя задачы выступаюць у якасці рэсурсу развіцця матывацыі навучэнцаў да пазнавальнай дзейнасці і спрыяюць сістэматызацыі прадметных ведаў на дзейнаснай практыка-арыентаванай аснове, калі студэнты, асвойваючы ўніверсальныя спосабы дзейнасці, вырашаюць асобасназначныя праблемы з выкарыстаннем прадметных ведаў.

У выніку выкарыстання кейс-метаду ў адукацыйным працэсе значна павышаецца якасць навучання, што дапамагае студэнтам больш упэўнена выкарыстоўваць прафесійную лексіку ў рэальных сітуацыях.

Літаратура:

1. Алексинская, А. Ю. Актуальность кейс-технологии в обучении основным видам речевой деятельности на занятиях по русскому языку как иностранному / А. Ю. Алексинская, Е. А. Железнякова // Вестник Московского государственного областного университета. – 2021. – № 3. – С. 38–46.

2. Орлов, Ю. Л. Кейс-метод как педагогическая технология интерактивного обучения, используемая в образовательном процессе магистрантов, изучающих восточные боевые искусства / Ю. Л. Орлов, Х. Ван, Л. Г. Рыжкова // Психология и педагогика спортивной деятельности. – 2024. – № 3. – С. 75–77.

# МЕЖДУНАРОДНАЯ НАУЧНАЯ ЛИНГВИСТИЧЕСКАЯ ЛАБОРАТОРИЯ: ОРГАНИЗАЦИЯ НАУЧНО-ИССЛЕДОВАТЕЛЬСКОЙ РАБОТЫ СТУДЕНТОВ

**Ковынева И. А.,[1] Петрова Н. Э.,[1]**
**Мельникова Т. Н.,[2] Пустошило Е. П.[3]**

[1] Курский государственный медицинский университет
г. Курск, Российская Федерация
[2] Белорусский государственный медицинский университет
г. Минск, Республика Беларусь
[3] Гродненский государственный медицинский университет
г. Гродно, Республика Беларусь

В современных условиях расширения международного сотрудничества Российской Федерации (РФ) и Республики Беларусь (РБ) на базе медицинских университетов (КГМУ, БГМУ, ГрГМУ) в 2024 году была открыта Международная научная лингвистическая лаборатория (МНЛЛ) как структура, объединяющая вышеназванные вузы, областью научных исследований которых является методика преподавания русского языка (в том числе русского языка как иностранного) [1–2]. Одной из многочисленных задач, заявленных



Репозиторий ГрГМУ